Табліца 1

Нормы ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, якая ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|---|
| 1. | 1 (адзін) | Пазнаванне з дапамогай настаўніка асобных элементаў праграмнага вучэбнага матэрыялу (літаратуразнаўчых тэрмінаў, паняццяў, фактаў з жыцця і творчасці пісьменніка, фрагментаў мастацкага твора па апісанні або вызначэнні, галоўных персанажаў) |
| 2. | 2 (два) | Самастойнае пазнаванне і адрозненне асобных элементаў праграмнага вучэбнага матэрыялу (літаратуразнаўчых тэрмінаў, паняццяў, фактаў з жыцця і творчасці пісьменніка, фрагментаў мастацкага твора па апісанні або вызначэнні, галоўных персанажаў) |
| 3. | 3 (тры) | Узнаўленне па памяці (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) праграмнага вучэбнага матэрыялу (азначэнняў літаратуразнаўчых паняццяў, літаратурных фактаў).<br>Пераказ (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) фрагментаў мастацкага твора ў пэўнай паслядоўнасці.<br>Вызначэнне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) жанру, элементаў кампазіцыі мастацкага твора.<br>Знаходжанне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) інфармацыі, прад'яўленай у вывучаным матэрыяле ў яўным выглядзе |
| 4. | 4 (чатыры) | Самастойнае ўзнаўленне па памяці праграмнага вучэбнага матэрыялу (азначэнняў літаратуразнаўчых паняццяў, літаратурных фактаў).<br>Пераказ фрагментаў мастацкага твора ў пэўнай паслядоўнасці.<br>Самастойнае вызначэнне на рэпрадуктыўным узроўні жанру, асаблівасцей кампазіцыі мастацкага твора.<br>Самастойнае ўзнаўленне фактычнага матэрыялу.<br>Самастойнае знаходжанне інфармацыі, прад'яўленай у вывучаным матэрыяле ў яўным выглядзе |
| 5. | 5 (пяць) | Узнаўленне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) на ўзроўні разумення праграмнага вучэбнага матэрыялу з указаннем літаратурных фактаў, тлумачэннем прычынна-выніковых сувязей.<br>Параўнанне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) мастацкіх твораў па зададзеных прыметах (тэма, ідэя, вобразная сістэма).<br>Правядзенне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай |

| | | |
|---|---|---|
| | | настаўніка) аналізу элементаў мастацкага твора па алгарытме.<br>Устанаўленне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) унутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей пры ўзнаўленні вучэбнага матэрыялу.<br>Знаходжанне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) інфармацыі, прад'яўленай у вывучаным матэрыяле ў няяўным выглядзе (атрыманне дадатковай інфармацыі з табліцы, схемы, малюнка, іншых сродкаў) |
| 6. | 6<br>(шэсць) | Самастойнае ўзнаўленне на ўзроўні разумення праграмнага вучэбнага матэрыялу з указаннем літаратурных фактаў, тлумачэннем прычынна-выніковых сувязей.<br>Самастойнае параўнанне мастацкіх твораў па зададзеных прыметах (тэма, ідэя, вобразная сістэма).<br>Самастойнае правядзенне аналізу элементаў мастацкага твора па алгарытме.<br>Самастойнае ўстанаўленне ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей пры ўзнаўленні вучэбнага матэрыялу.<br>Самастойнае знаходжанне інфармацыі, прад'яўленай у вывучаным матэрыяле ў няяўным выглядзе (атрыманне дадатковай інфармацыі з табліцы, схемы, малюнка, іншых сродкаў) |
| 7. | 7<br>(сем) | Прымяненне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) літаратуразнаўчых і культурна-гістарычных ведаў у знаёмай сітуацыі па ўзоры (вызначэнне жанравых, кампазіцыйных, мастацкіх асаблівасцей літаратурнага твора, ролі мастацка-выяўленчых сродкаў, выкарыстанне фактаў біяграфіі пісьменнікаў у кантэксце аналізу літаратурнага працэсу).<br>Выкананне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) цэласнага аналізу літаратурнага твора па зададзеным алгарытме.<br>Аргументацыя (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) уласных адносін да прачытанага твора, ацэнка стандартных сітуацый па маральных крытэрыях.<br>Складанне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) планаў, тэзісаў, канспектаў артыкулаў, вуснага і/або пісьмовага выступлення на літаратурную тэму.<br>Устанаўленне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) унутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей у працэсе вырашэння вучэбных задач.<br>Вызначэнне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) структурных частак вучэбнага матэрыялу, устанаўленне сувязей паміж сэнсавымі адзінкамі інфармацыі, прадстаўленай у розных знакавых сістэмах |

| | | |
|---|---|---|
| | | (тэкставай, графічнай, іншай знакавай сістэме) і розных формах (табліцы, схемы, малюнкі, іншыя формы); тлумачэнне вучэбнай інфармацыі (выяўленне галоўнага і другаснага, агульнага і адрознага, прычынна-выніковых сувязей; фармулёўка высноў са зместу вучэбнага матэрыялу) |
| 8. | 8<br>(восем) | Самастойнае прымяненне літаратуразнаўчых і культурна-гістарычных ведаў у знаёмай сітуацыі па ўзоры (вызначэнне жанравых, кампазіцыйных, мастацкіх асаблівасцей літаратурнага твора, ролі мастацка-выяўленчых сродкаў, выкарыстанне фактаў біяграфіі пісьменнікаў у кантэксце аналізу літаратурнага працэсу).<br>Самастойнае выкананне цэласнага аналізу літаратурнага твора па зададзеным алгарытме.<br>Самастойная аргументацыя ўласных адносін да прачытанага твора, ацэнка стандартных сітуацый па маральных крытэрыях.<br>Самастойнае складанне планаў, тэзісаў, канспектаў артыкулаў, вуснага і/або пісьмовага выступлення на літаратурную тэму.<br>Самастойнае ўстанаўленне ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей у працэсе вырашэння вучэбных задач.<br>Самастойнае вызначэнне структурных частак вучэбнага матэрыялу, устанаўленне сувязей паміж сэнсавымі адзінкамі інфармацыі, прадстаўленай у розных знакавых сістэмах (тэкставай, графічнай, іншай знакавай сістэме) і розных формах (табліцы, схемы, малюнкі, іншыя формы); тлумачэнне вучэбнай інфармацыі (выяўленне галоўнага і другаснага, агульнага і адрознага, прычынна-выніковых сувязей; фармулёўка высноў са зместу вучэбнага матэрыялу) |
| 9. | 9<br>(дзевяць) | Аперыраванне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) праграмным вучэбным матэрыялам, прымяненне ведаў і ўменняў у незнаёмай, нестандартнай сітуацыі, якая патрабуе валодання прыёмамі аналізу мастацкага твора, літаратурнага факта, уключэння мастацкага твора ў літаратурны кантэкст, праецыравання сюжэта мастацкага твора на паўсядзённае жыццё, супастаўлення твораў розных відаў мастацтва.<br>Інтэграцыя (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) ведаў з розных прадметных галін для фармулёўкі абгрунтаваных высноў.<br>Устанаўленне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) прычынна-выніковых сувязей паміж рознымі літаратурнымі фактамі.<br>Арганізацыя (з дапамогай настаўніка) і ўдзел у розных відах сумеснай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці (творчы |

| | | |
|---|---|---|
| | | праект, пастаноўка фрагментаў твораў, конкурс чытальнікаў, літаратурная гасцёўня, навукова-практычная канферэнцыя, іншыя віды вучэбна-пазнавальнай дзейнасці).<br>Дэманстрацыя схільнасці да літаратурнай творчасці.<br>Аргументацыя (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) уласных адносін да прачытанага твора, ацэнка нестандартных сітуацый па маральных крытэрыях.<br>Параўнанне (не ў поўным аб'ёме і/або з дапамогай настаўніка) вучэбнай інфармацыі і ўласнага вопыту, пабудова на гэтай аснове аргументацыі для цэласнага аналізу мастацкага твора, лагічнае абгрунтаванне ўласнага пункту погляду на прадмет абмеркавання, вызначэнне каштоўнасці вучэбнай інфармацыі для вырашэння пастаўленай вучэбнай задачы, выкарыстанне інфармацыі для вырашэння вучэбнай або практычнай задачы |
| 10. | 10<br>(дзесяць) | Самастойнае аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам, прымяненне ведаў і ўменняў у незнаёмай, нестандартнай сітуацыі, якая патрабуе валодання прыёмамі аналізу мастацкага твора, літаратурнага факта, уключэння мастацкага твора ў літаратурны кантэкст, праецыравання сюжэта мастацкага твора на паўсядзённае жыццё, супастаўлення твораў розных відаў мастацтва.<br>Самастойная інтэграцыя ведаў з розных прадметных галін для фармулёўкі абгрунтаваных высноў.<br>Самастойнае ўстанаўленне прычынна-выніковых сувязей паміж рознымі літаратурнымі фактамі.<br>Самастойная арганізацыя і ўдзел у розных відах сумеснай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці (творчы праект, пастаноўка фрагментаў твораў, конкурс чытальнікаў, літаратурная гасцёўня, навукова-практычная канферэнцыя, іншыя віды вучэбна-пазнавальнай дзейнасці).<br>Выяўленне схільнасці да літаратурнай творчасці і прад'яўленне гатовых творчых прадуктаў.<br>Самастойная аргументацыя ўласных адносін да прачытанага твора, ацэнка нестандартных сітуацый па маральных крытэрыях.<br>Самастойнае параўнанне вучэбнай інфармацыі і ўласнага вопыту, пабудова на гэтай аснове аргументацыі для цэласнага аналізу мастацкага твора, лагічнае абгрунтаванне ўласнага пункту погляду на прадмет абмеркавання, вызначэнне каштоўнасці вучэбнай інфармацыі для вырашэння пастаўленай вучэбнай задачы, выкарыстанне інфармацыі для вырашэння вучэбнай або практычнай задачы |

Заўвагі:

1. Вынікі вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» ацэньваюцца па наступных параметрах:

змястоўнасць і глыбіня вуснага і пісьмовага выказвання, якія адлюстроўваюць якасць успрымання і разумення мастацкага твора, сфарміраванасць аналітычных і маўленчых уменняў, здольнасць выкарыстоўваць іх на практыцы;

самастойнасць ацэнак падзей і характараў у мастацкіх творах, іх аргументаванасць;

здольнасць да выяўлення міжпрадметных сувязей, да выкарыстання інфармацыі з розных крыніц; уменне выходзіць за рамкі мастацкага твора;

выразнасць чытання твораў розных жанраў.

2. Пры ацэньванні вусных выказванняў і пісьмовых работ вучняў (разгорнуты адказ на пытанне, пераказ, аповед пра героя, іншыя віды) улічваюцца:

правільнасць і матываванасць адбору эпізодаў, малюнкаў, дэталей для вырашэння пастаўленай задачы;

разуменне ўзаемасувязі падзей, учынкаў, характараў персанажаў і важнейшых сродкаў іх паказу (у адпаведнасці з асноўнымі патрабаваннямі да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, вызначаннымі вучэбнай праграмай для адпаведнага класа);

кампазіцыйная стройнасць і логіка пабудовы адказу;

культура маўлення (захаванне арфаэпічных і акцэнталагічных норм; правільнае інтанаванне).

Тэматычны кантроль па вучэбным прадмеце можа ажыццяўляцца ў формах, відах дзейнасці вучняў, якія дазваляюць ацаніць вучэбныя дасягненні вучняў у лагічнай сістэме і адпавядаюць структуры вучэбнай тэмы (тэм): творчая работа на літаратурную тэму, пісьмовае выказванне (аргументаваны адказ на пытанне, выкананне рознаўзроўневых заданняў), абарона тэматычнай праектнай работы, іншыя віды дзейнасці вучняў.

Табліца 2

Нормы ацэнкі выразнага чытання на памяць

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|---|
| 1. | 1 (адзін) | Узнаўленне фрагмента тэксту (менш за 20 %) |
| 2. | 2 (два) | Фрагментарнае ўзнаўленне тэксту (менш за 40 %). Чытанне манатоннае, са шматлікімі памылкамі |
| 3. | 3 (тры) | Няпоўнае ўзнаўленне тэксту (не больш за 60 %). Чытанне манатоннае, з вялікай колькасцю памылак |
| 4. | 4 (чатыры) | Няпоўнае ўзнаўленне тэксту (не больш за 80 %). Спробы эмацыянальна адгукацца на перажыванні, |

| | | |
|---|---|---|
| | | увасобленыя ў мастацкім тэксце. Частковы ўлік знакаў прыпынку пры інтанаванні. Наяўнасць памылак |
| 5. | 5 (пяць) | Поўнае ўзнаўленне тэксту з некалькімі памылкамі. Слабае інтанаванне, павярхоўнае асэнсаванне твора. Улік знакаў прыпынку пры інтанаванні |
| 6. | 6 (шэсць) | Чытанне на памяць з нязначнымі памылкамі. Захаванне сэнсавых паўз. Спробы эмацыянальна ўключыцца ў прапанаваную сітуацыю і перадаць голасам настрой |
| 7. | 7 (сем) | Чытанне на памяць з нязначнымі памылкамі, спроба ўзнавіць голасам і інтанацыяй пачуцці і перажыванні героя. Спроба ўзнаўлення эмацыянальнага напружання тэксту |
| 8. | 8 (восем) | Выразная дыкцыя пры добрым веданні тэксту. Правільная перадача аўтарскай інтанацыі. Узнаўленне эмацыянальнага напружання тэксту. Дапускаюцца 1-2 запінкі |
| 9. | 9 (дзевяць) | Поўнае валоданне тэкстам. Выразная разнастайнасць узнаўлення. Спробы самастойнай інтэрпрэтацыі аўтарскай пазіцыі |
| 10. | 10 (дзесяць) | Бездакорнае валоданне тэкстам. Інтанацыйна багатае ўзнаўленне на аснове самастойнай інтэрпрэтацыі аўтарскай пазіцыі |

Заўвагі:

1. Праверка і ацэнка выразнага чытання на памяць ажыццяўляецца пры правядзенні паўрочнага кантролю.

2. Пры ацэньванні выразнага чытання твораў на памяць улічваецца дакладнасць узнаўлення тэксту, правільнае інтанаванне, разуменне вучнямі сэнсу твора, якое выражаецца з дапамогай тэмбру, мімікі, жэсту, іншых сродкаў.

Табліца 3

Нормы ацэнкі выразнага чытання (для V–VIII класаў)

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|---|
| 1. | 1 (адзін) | Чытанне па складах або чытанне асобных слоў без захавання інтанацыі сказа і без уліку знакаў прыпынку |
| 2. | 2 (два) | Чытанне па словах, з памылкамі ў канчатках, без захавання інтанацыі сказа і без уліку знакаў прыпынку |
| 3. | 3 (тры) | Чытанне па словазлучэннях, з акцэнталагічнымі памылкамі і няправільным лагічным націскам |
| 4. | 4 (чатыры) | Чытанне па словазлучэннях. Манатоннасць. Недарэчныя паўзы або паскарэнне чытання. Невыразнае вымаўленне слоў |

| | | |
|---|---|---|
| 5. | 5<br>(пяць) | Чытанне па фразах. Частковае захаванне інтанацыі пры знаках прыпынку. Невыразнае вымаўленне канчаткаў |
| 6. | 6<br>(шэсць) | Чытанне па фразах з захаваннем сэнсавых паўз і інтанацыі пры знаках прыпынку. Наяўнасць 2-3 арфаэпічных памылак |
| 7. | 7<br>(сем) | Беглае чытанне па фразах з захаваннем сэнсавых паўз і інтанацыі сказа. Наяўнасць 1-2 арфаэпічных памылак |
| 8. | 8<br>(восем) | Свабоднае чытанне з захаваннем арфаэпічных норм. Дапускаецца арфаэпічная памылка, якая самастойна выпраўляецца вучнем |
| 9. | 9<br>(дзевяць) | Чытанне выразнае, інтанацыйна багатае. Адсутнасць арфаэпічных памылак |
| 10. | 10<br>(дзесяць) | Бездакорнае, інтанацыйна багатае чытанне тэксту з захаваннем арфаэпічных норм |

Заўвага:

Пры ацэньванні выразнасці чытання ўлічваецца:

бегласць (паскладовае, пaслоўнае, фразавае чытанне); правільнасць (захаванне вымаўленчых норм, матываваная расстаноўка паўз, лагічных націскаў); правільнасць (правільнае вымаўленне слоў і канчаткаў); інтанацыйная выразнасць;

не улічваецца хуткасць чытання.